Комуністычная партыя (большэв'коў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

№ 12 (5138)
СТУДЗЕНЬ
14
ПАНЯДЗЕЛАК
1935 г.
год выдання XVII

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

*Пролетары ўсіх краін, злучайцеся*

## *Сёння ў Доме ўрада адкрываецца XI Усебеларускі з'езд советаў*

# Палкае большэвіцкае прывітанне дэлегатам XI усебеларускага з'езда Советаў!



## ПРЫВІТАННЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАМУ З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ

## XI УСЕБЕЛАРУСКІ

Сення ў велічным Доме ўрада, перад якім высіцца як магутны несакрушальны гігант помнік вечна жывому Ільічу, адкрываецца XI з'езд советаў Соцыялістычнай Беларусі.

На з'езд прыехалі не толькі лепшыя людзі Совецкай Беларусі, перадавыя байцы за справу партыі, справу Леніна-Сталіна. На наш з'езд прыехалі прадстаўнікі брацкіх рэспублік Саюза, дэлегаты ад іншых народаў нашай соцыялістычнай радзімы. Яны будуць разам з намі радавацца заваяваным перамогам, аглядаючы ў думках шлях, які прайшла Беларусь к XI з'езду советаў. Яны будуць разам з намі гаварыць аб тым, што яшчэ не зроблена, што яшчэ трэба зрабіць, каб Беларусь стала перадавой, квітнеючай рэспублікай у брацкай сям'і народаў краіны Советаў.

З'езд советаў Беларусі адкрываецца ў той гістарычны час, калі Совецкі Саюз, пад кіраўніцтвам мудрэйшага з чалавецтва, лепшага з лепшых саратнікаў Ільіча — ЮСІФА ВІСАРЫЁНАВІЧА СТАЛІНА, заваяваў буйнейшыя перамогі ў баях за соцыялізм. СССР стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай, гатовай сакрушыць любое свінное рыла, як толькі яно адважыцца сунуцца ў наш совецкі агарод. СССР стаў краінай металічнай, краінай аўтамабілізацыі і трактарызацыі, краінай, дзе воляй партыі і рабочага класа пабудаваны буйнейшыя ў свеце індустрыяльныя волаты, краінай, дзе працоўнае сялянства беспаваротна стала пад чырвоныя сцягі соцыялізма.

Адмена картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах красамоўна дэманструе наш бурны рост, таржаство справы калгасаў.

Рабочыя і калгасныя масы Совецкай Беларусі бязмежна шчаслівы, што разам з усімі народамі Совецкага Саюза яны маюць магчымасць [illegible] сваіх вузкіх, спустошаных палосках, згінаючыся над сахой, краіна, куды царызм ссылаў «небяспечных вольнадумцаў», краіна, аб якой Александр Іванавіч Герцен гаварыў, што лепш быць высланым у Сібір, чым у тагочасную Беларусь. Пасля Беларусь захвацілі інтэрвенты, белапольскія акупанты. Успомніце спаленыя гарады і мястэчкі, зруйнаваныя заводы і вёскі, успомніце тысячы лепшых сыноў рабочага класа і працоўнага сялянства, павешаных і расстраляных акупантамі і контррэволюцыйнай нацдэмаўскай радай.

І вось сёнешні дзень. Недалёка, па той бок граніцы, нашы браты па класу — рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі — пакутуюць пад ярмом фашысцкай дыктатуры, у цісках голаду і галечы.

Як-жа радасна, як бурна пульсуе новае жыццё ў нас, у БССР, як і ва ўсёй краіне Советаў, як бурна расцвітае бязмежная творчасць рабочага класа. Як у корані, непазнавальна зменена карта Совецкай Беларусі. Совецкая Беларусь стала краінай развітай прамысловасці.

2 проц. калектывізацыі і некалькі трактароў у 1929 годзе, а цяпер —звыш 70 проц. калектывізаваных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, магутны трактарны парк, дзесяткі тысяч навейшых складаных машын.

Нашы школы, нашы клубы і музеі, тэатры і кіно, Акадэмія Навук, універсітэт, даследчыя інстытуты, бурна растучыя тыражы газет і кніг у БССР, паспяховае ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага навучання — красамоўныя і глыбока пераканаўчыя паказальнікі таго, наколькі імкліва, наколькі магутна расцвітае беларуская нацыянальная культура, соцыялістычная па свайму зместу.

КП(б)Б, яе Цэнтральны Камітэт, уся Совецкая Беларусь асабліва адчуваюць тую нязмерную дапамогу, [illegible] кіраўніцтва, якія штодзенна [illegible] най Беларусі, дасягнулі выдатнейшых поспехаў.

Аб гэтым гаворыць перш за ўсё тое, што Совецкая Беларусь упершыню за ўсе гады паспяхова завяршыла сельскагаспадарчы год, вышаўшы на адно з першых месц у СССР. Аб гэтым гаворыць карэнны і рашаючы зрух у рабоце беларускай прамысловасці, якая яшчэ ніколі не дасягала такіх рэзультатаў, з якімі яна скончыла 1934 год.

Але зроблена яшчэ далёка не ўсё. Наперадзе стаяць гіганцкія задачы. З'езд павінен прайсці пад знакам большэвіцкай самакрытыкі, пад знакам смелага выяўлення ўсіх яшчэ не зжытых недахопаў, зарадзіць кожнага дэлегата рэволюцыйнай энергіяй к барацьбе за пераўтварэнне БССР у перадавую ўзорную рэспубліку, дастойную ордэна Леніна.

Гнусныя і подлыя падонкі контррэволюцыі, нікчэмныя адшчапенцы чалавечага роду, белабандыцкія фашысцкія паследкі антысовецкай зіноўеўскай групы вырвалі з нашых радоў правадыра партыі і рабочага класа, лепшага саратніка Сталіна — тав. Сергея Міронавіча КІРАВА.

Але ад здрадніцкага стрэлу не пахіснуліся рады большэвікоў. Атрэп'е контррэволюцыі, фашысцкія белабандыты з зіноўеўскай групы раздаўлены жалезным мячом пролетарскай дыктатуры. Уся партыя, уся краіна, мільёны рабочых і сялян яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта, вакол любімага Сталіна. Павысіць рэволюцыйную пільнасць, знішчыць астаткі ворага — першая свяшчэнная запаведзь.

Лінія партыі—лінія советаў. Пад гэтым лозунгам советы БССР дасягнулі буйнейшых поспехаў. Але ніякай самасупакоенасці. Яшчэ больш умацаваць советы, яшчэ больш умацаваць пролетарскую дыктатуру, каб яна была яшчэ больш магутнай і моцнай здольнай разве-



## ПРЫВІТАННІ БРАЦКІХ КОМПАРТЫЙ XI УСЕБЕЛАРУСКАМУ З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ

